# ВЫВУЧЭННЕ АРФАГРАФІІ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ Ў ІНШАФОННАЙ АЎДЫТОРЫІ

У аснове працэсу навучання беларускай мове як замежнай ляжыць вучэбная дзейнасць, якая здзяйсняецца з мэтай перадачы і атрымання ведаў і фарміравання маўленчых навыкаў і ўменняў. Вучэбная дзейнасць, як і любы інтэлектуальны акт, характарызуецца наяўнасцю матываў, іх выканання і кантролю.

Выяўленчыя магчымасці беларускай літаратурнай мовы вельмі шырокія: яе граматычная сістэма складаная і шматгранная, лексічны і фразеалагічны склад невычэрпныя, жанрава-стылістычныя разнавіднасці тонка распрацаваныя. Даволі складанымі для засваення іншафонамі з'яўляюцца беларускія арфаграфічныя правілы.

Фарміраванне арфаграфічнай пісьменнасці выступае адной з галоўных задач навучання беларускай мове як замежнай, паколькі:

1) арфаграфічная пісьменнасць – абавязковы кампанент агульнай моўнай культуры чалавека, які забяспечвае дакладнасць выражэння думкі і ўзаемаразумення пры пісьмовай камунікацыі;

2) пісьмовая форма літаратурнай мовы істотна адрозніваецца ад вуснай.

У навучальным працэсе забяспечваецца паскораны тэмп пазнання з'яў рэчаіснасці: працэс навучання будуецца з улікам індывідуальных асаблівасцей іншафонаў, што прадугледжвае вар'іраванне форм і метадаў іх пазнаваўчай дзейнасці. Арфаграфічныя веды набываюцца навучэнцамі не шляхам сузірання пэўных аб'ектаў, а апасродкавана, пераважна праз слова выкладчыка і апісанне арфаграм і апорных напісанняў. Для таго, каб засвоіць правілы беларускай арфаграфіі, хутка і дакладна прымяняць іх, навучэнцы павінны авалодаць адпаведнымі агульнымі ўменнямі і навыкамі.

Навыкі – гэта аўтаматызаваныя кампаненты дзейнасці, якія ўключаюцца ў мэтанакіраваную актыўнасць чалавека. У працэсе выпрацоўкі навыку збыткоўныя рухі і аперацыі ліквідуюцца або зліваюцца ў адно складанае дзеянне, свядомасць накіроўваецца не на спосабы дзеяння, а пераносіцца на яго вынікі, павялічваецца хуткасць ажыццяўлення рухальных і інтэлектуальных аперацый, паляпшаецца самакантроль.

Адным з найбольш істотных кампанентаў развіцця маўлення з'яўляецца ***арфаграфічны навык*** – навык нарматыўнага пісьма. На занятках па беларускай мове як замежнай фарміруюцца наступныя віды арфаграфічных уменняў і навыкаў:

1. выяўленне ў слове арфаграм;
2. напісанне слоў з вывучанымі арфаграмамі;
3. абгрунтаванне арфаграм;
4. выяўленне і выпраўленне арфаграфічных памылак.

Уменні і навыкі фарміруюцца на аснове выканання сістэмы практыкаванняў, удасканальваюцца і замацоўваюцца ў працэсе творчага іх прымянення ў зменлівых сітуацыях. Пры гэтым вылучаюцца наступныя стадыі

фарміравання арфаграфічнага навыку: успрыманне, імітацыя, усвядомленае прайграванне, дыферэнцыяцыя, гукавое (інтанацыйнае) камбінаванне.

Абагульняючы наяўныя ў сучаснай лінгваметодыцы ўяўленні пра фарміраванне арфаграфічных навыкаў, можна сцвярджаць, што арфаграфічныя навыкі праходзяць у сваім развіцці чатыры стадыі.

***Азнаямленчы этап.*** Знаёмства з моўнай з'явай і правіламі яе выканання. Забяспечваецца выразнае разуменне сэнсу з'явы, але недастаткова выразнае ўяўленне пра спосабы яго выканання прыводзіць да памылак пры выкананні арфаграфічнага дзеяння.

***Аналітычны этап.*** Свядомае, але не заўсёды беспамылковае выкананне арфаграфічнага дзеяння. Апора пры выкананні дзеяння на правілы і інструкцыі.

***Стандартызацыйны этап.*** Дасягненне аўтаматызму пры выкананні арфаграфічнага дзеяння ў выніку выкарыстання трэнінгавых практыкаванняў. Скарачаецца час на аналіз дзеяння і выкарыстанне апор у выглядзе правіл і інструкцый.

***Варыяцыйны этап.*** Далейшая аўтаматызацыя выканання арфаграфічнага дзеяння ў выніку яго пераносу ў розныя сітуацыі зносін. Дасягаецца гнуткасць выканання дзеяння, пры якім увага засяроджана і на змесце выказвання, і на яго форме. Арфаграфічны навык пры гэтым уключаецца ў розныя маўленчыя ўменні.

Пры правядзенні практыкаванняў неабходна ўлічваць спецыфічныя ўмовы працы з той ці іншай групай замежных навучэнцаў:

1. ступень падрыхтаванасці навучэнцаў, стан іх ведаў і навыкаў у галіне арфаграфіі;
2. агульны ўзровень маўленчай культуры;
3. умовы маўленчага і культурнага асяроддзя;

Паспяховаму навучанню правапісу спрыяе:

1. старанны адбор дыдактычнага матэрыялу;
2. разнастайнасць практыкаванняў, якія абапіраюцца на правілы і розныя віды памяці;
3. паступовае ўскладненне арфаграфічных ведаў;
4. узмацненне ролі самастойнасці навучэнцаў у выкананні арфаграфічных заданняў.

Выкарыстанне разнастайных прыёмаў і практыкаванняў – абавязковая ўмова паспяховай працы па арфаграфіі. Аднак выбар прыёмаў не павінен быць стыхійным. Пры вызначэнні таго, які прыём ці якое практыкаванне мэтазгодна выкарыстаць у кожным канкрэтным выпадку, варта ўлічваць іх спецыфіку. Мэтазгоднасць ужывання таго ці іншага прыёму або практыкавання з пункту гледжання лінгваметодыкі вызначаецца наступнымі ўмовамі:

1. ступень адпаведнасці яго вывучанаму ў дадзены момант матэрыялу;
2. падрыхтаванасць навучэнцаў да засваення вучэбнага матэрыялу;
3. даступнасць прыёму з пункту гледжання тых навыкаў самастойнай працы, якімі ўжо валодаюць іншафоны;
4. паслядоўнасць ва ўжыванні адпаведных прыёмаў.

Уяўленне аб паслядоўнасці арфаграфічных практыкаванняў і іх адпаведнасці мэтам і задачам навучання на розных этапах засваення навыкаў можа даць наступная табліца:

| Дыдактычная мэта (задача) | Тып практыкавання |
|---|---|
| Актуалізацыя апорных ведаў і навыкаў | Падрыхтоўчыя практыкаванні |
| Засваенне ведаў (правілаў, паняццяў) | Уступныя практыкаванні (пазнаваўчыя, матывацыйныя) |
| Першаснае прымяненне ведаў | Выпрабавальныя практыкаванні |
| Авалоданне навыкамі ў стандартных умовах | Трэнінгавыя практыкаванні (у адпаведнасці з узорам, інструкцыяй, ключом-адказам) |
| Творчы перанос ведаў і навыкаў у нестандартныя ўмовы (засваенне ўменняў) | Творчыя практыкаванні |
| Кантроль, карэкцыя навыкаў і ўменняў | Кантрольныя практыкаванні |

Мэта ***падрыхтоўчых практыкаванняў*** – падрыхтоўка навучэнцаў да ўспрымання новых ведаў і спосабаў іх ужывання на практыцы. Такія практыкаванні маюць пераважна рэпрадуктыўны характар. Самастойнасць навучэнцаў пры іх выкананні мінімальная.

***Уступныя практыкаванні*** выкарыстоўваюцца для таго, каб стварыць у навучэнцаў праблемную сітуацыю як спосаб матывацыі навучання, падрыхтаваць умовы для самастойнага пошуку новых спосабаў выканання дзеянняў ці фарміравання адпаведнага правіла (алгарытму), падвесці іншафонаў да разумення апорнага тэарэтычнага матэрыялу, падрыхтаваць іх да асэнсавання правіла, закона, якія з’яўляецца асновай для засваення навыкаў.

***Выпрабавальныя практыкаванні*** – гэта элементарныя заданні на ўжыванне толькі што атрыманых ведаў. Іх выкарыстоўваюць тады, калі новы матэрыял засвоены яшчэ нетрывала і навучэнцы могуць дапусціць памылкі ў яго ўжыванні.

***Трэнінгавыя практыкаванні*** накіраваны на засваенне навучэнцамі арфаграфічных навыкаў у стандартных умовах. Ад праблемных яны адрозніваюцца большай ступенню самастойнасці і ініцыятывы навучэнцаў у іх выкананні, а таксама рознай ступенню складанасці заданняў.

Дыдактычная мэта ***творчых практыкаванняў*** заключаецца ў тым, каб сфарміраваць у навучэнцаў уменне правільна і хутка вырашаць праблемы на аснове творчага ўжывання атрыманых ведаў і набытых навыкаў.

***Кантрольныя практыкаванні*** маюць пераважна навучальны характар. Гэта комплексныя заданні, у якіх спалучаюцца рэпрадуктыўныя і творчыя элементы. Кантрольныя заданні павінны ўключаць тыповыя сітуацыі без нематываванага ўскладнення зместу.

Адзначым, што важнай умовай фарміравання арфаграфічных навыкаў з'яўляецца варыянтнасць дыдактычнага матэрыялу, падабранага з улікам цяжкасцей замежных навучэнцаў ва ўжыванні арфаграфічных правіл. Вядома,

што арфаграфічны навык з’яўляецца неабходным кампанентам пісьмовага маўлення, таму заняткі па арфаграфіі павінны спалучацца з працай па развіцці беларускага маўлення іншафонаў. Акрамя таго, вельмі важна, каб навучэнцы прайшлі праз этап “сумяшчэння” дзвюх задач: выражаць свае думкі ў пісьмовай форме і прытрымліваецца пры гэтым арфаграфічных норм.

Вылучым шэсць этапаў, якія павінны прайсці замежныя навучэнцы для вырашэння арфаграфічнай задачы:

1. убачыць арфаграму ў слове;
2. вызначыць яе тып (від);
3. вызначыць спосаб вырашэння задачы ў залежнасці ад тыпу (віду) арфаграмы;
4. вызначыць “крокі”, прыступкі вырашэння і іх паслядоўнасць – скласці алгарытм дзеянняў;
5. вырашыць задачу – выканаць паслядоўныя дзеянні па алгарытме;
6. напісаць слова ў адпаведнасці з вырашэннем задачы і правесці самаправерку.

Як асноўныя прынцыповыя палажэнні гэтай метадычнай сістэмы, так і многія прыватныя прыёмы навучання можна выкарыстаць на занятках па практыцы беларускага маўлення. Перш за ўсё неабходна ўжо на базавым узроўні навучання мове ўзброіць іншафонаў ведамі аб тых апазнавальных прыметах, па якіх яны маглі б, яшчэ не валодаючы арфаграфічнымі правіламі, выяўляць пераважную большасць арфаграм. Мы лічым, што істотную частку арфаграм беларускай мовы складаюць арфаграмы слабых пазіцый, да якіх у першую чаргу належаць ненаціскныя галосныя ў розных частках слова, зычныя, парныя па звонкасці – глухасці, якія стаяць на канцы слоў і перад іншымі зычнымі, а таксама пазіцыі суседства свісцячых – шыпячых і выбухных – афрыкат.

Навучанне арфаграфіі на пачатковым этапе вывучэння беларускай мовы мае пераважна прапедэўтычны характар: іншафоны на практыцы атрымліваюць неабходныя звесткі аб галосных і зычных гуках, а таксама адпаведных літарах. Свядомасць і аўтаматызм пры навучанні арфаграфіі дасягаюцца ў працэсе працы над правіламі і арфаграфічнымі практыкаваннямі, якія забяспечваюць засваенне навыкаў пісьмовага маўлення.

Выбар метадаў і прыёмаў навучання арфаграфіі вызначаецца характарам арфаграм, якія могуць быць у любой частцы слова: у прыстаўцы, корані, суфіксе, канчатку. На арфаграфічных занятках па беларускай мове як замежнай могуць выкарыстоўвацца наступныя ***метады***: слова выкладчыка, гутарка, назіранне, аналіз арфаграм, самастойная работа навучэнцаў.

Такім чынам, праблема арфаграфічнай пісьменнасці іншафонаў застаецца адной з цэнтральных праблем навучання беларускай мове як замежнай. Асабліва важнае значэнне мае выпрацоўка арфаграфічных навыкаў, заснаваных на свядомым выкарыстанні граматычных ведаў, выкарыстанне арфаграфічных правіл, якія прадугледжваюць актыўную інтэлектуальную дзейнасць навучэнцаў.